# ШЛЯХАМ САМАСЦВЯРДЖЭННЯ

*Аляксей РАГУЛЯ*

Татальны крызіс сучаснай цывілізацыі сёння ставіць асветніцкую і педагагічную думку перад неабходнасцю знайсці годны адказ на нігілісцкія выклікі.

З году ў год школьная бюракратыя звужае аб'ём гуманітарнага ведання ў агульнаадукацыйнай і вышэйшай школах. Апошнім часам з'явіліся нават спробы нібыта „філасофскага" абгрунтавання непатрэбнасці не толькі нацыі, але і чалавека наогул у цывілізацыйным працэсе. Дасягненні ў галінах мікрабіялогіі ды інфарматыкі адкрываюць вялікія магчымасці для нанатэхналогіяў, планавання і змены чалавечай псіхікі.

Безагляднае „тэсціраванне" сёння суправаджаецца разбурэннем культурнай памяці. Маладому пакаленню навязваецца схільнасць да прымітывізму і элементарызму ў падыходах да складаных праблем сучаснасці, у міжасабовых зносінах.

Этнічная самасвядомасць, якая спрадвеку была асноваю патрыятычнай кансалідацыі, абвяшчаецца з'яваю неабавязковаю ці нават непатрэбнаю. У Беларусі гэтыя разбуральныя тэндэнцыі замацаваліся ў нігілісцкім стаўленні на дзяржаўным узроўні да беларускай мовы. І гэта тады, калі вялікія дасягненні беларускай нацыі ў мастацкай культуры і асабліва ў мастацкай літаратуры адкрываюць новыя рэсурсы духоўнасці, так неабходныя еўрапейскаму чалавецтву, якое апынулася ў ваўчынай яме шызоіднага прагматызму.

Рэальны стан чалавечай сітуацыі ў Беларусі ставіць ТБШ перад неабходнасцю пераадольваць крызіс у асветніцкай і педагагічнай практыцы.

Галоўнай павінна быць арыентацыя не на чыноўніка, не на гульню ўзору „настаўнік года", а на настаўніка — адукаванага і дасведчанага патрыёта Бацькаўшчыны, здольнага да самастойнай педагагічнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння настаўніку навязваецца гульня ў квазінавацыі, якія скіроўваюць увагу вучняў убок ад спасціжэння культурных сэнсаў нацыянальнага гістарычнага досведу.

Маладое пакаленне павінна не толькі ведаць, але і эмацыйна перажыць пройдзены беларускім этнасам шлях самасцвярджэння *„назло крывавым перашкодам“* (Я.Купала), выразна разумець, цаніць і ўдасканальваць духоўныя і сацыяльныя ідэалы, створаныя продкамі для нас, цяперашніх, каб засвоіць пафас людскасці сваёй культуры — жыць з прагай *„людзьмі звацца“*.

А пачынаць працу трэба з распрацоўкі мадэлі педагога-асветніка, які валодае якасцю, абазначанай у псіхааналізе К.Чорнага як *„абвостраная цвёрдасць“* і *„здольнасць да непераможнай дзейнасці“*.

Мэтанакіраваная дзейнасць ТБШ патрабуе ад яго кіраўнікоў вялікай увагі да пытанняў, звязаных з фармаваннем навукова-творчых калектываў, з актывізацыяй выдавецкай дзейнасці, арганізацыяй прапагандысцкай працы, развіццём мастацка-творчай дзейнасці. А гэта значыць, што такія структуры ТБШ, як Метадычная камісія і Канцылярыя, павінны быць у стане бесперапыннага пошуку і дзеяння.

Зразумела, што ў сітуацыі перманентнага крызісу ад ТБШ нельга патрабаваць вырашэння ўсіх праблем адраджэння нацыянальнай школы, але рух і праца на гэтым кірунку — жыццёвая неабходнасць не толькі для Таварыства, але і для нацыі ў цэлым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ